■ Сітуацыя

# «Я ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, АЛЕСЯ!»

## Іншаземец пераехаў у Беларусь дзеля дачкі

**У канцы зімы маленькая Алеся святкуе дзень нараджэння. Сёлета сваё васьмігоддзе дзяўчынка адзначала без бацькі. Так было летась і залетась таксама. Ці ёсць у Алесі тата? Ёсць, і ён не курыць, не п'е, не гуляе. Вядома, купляе падарункі. Але запрасіць у госці яго нельга. Ці дзяўчынка не хоча? Ужо 5 гадоў не спыняюцца суды, скаргі, экспертызы. Аб'ём справавых дакументаў таўсцейшы за «Вайну і мір». Мунір Амар судзіцца, каб бачыцца з дачкой часцей. Дзеля сваёй крывінкі мужчына кінуў заакіянскую краіну, удалы юрыдычны бізнес, вывучыў рускую мову і 8 гадоў жыве ў Беларусі.**



### Наступствы аднаго кахання

Мунір і Алена пазнаёміліся ва ўсходніх казцы, Арабскіх Эміратах. Паміж імі ўспыхнула каханне. Дачка Алеся нарадзілася ў Беларусі. Праз тры гады сям'я распалася. Мірна падзяліць дзяўчынку не змаглі. Мунір хацеў бачыць дачку часцей і сам-насам. Алена хвалявалася, каб ён не вывез малую за мяжу, пераживала, бо іншаземец быў глухі да просьбаў Алесі, яе жаданняў. Скончыліся часы, калі сям'я весела падарожнічала па Еўропе і Афрыцы, а двухгадовая дзяўчынка бесклапотна спявала разам з бацькам англійскія песні, гуляла з ім у пясочніцы і была самай юнай чытачкай у гарадской бібліятэцы.

**«Любіць — гэта не заўсёды настойліва быць побач, часам любіць — гэта сціснуўшы зубы адпусціць дзеля спакою таго, каго любіш».**

Гэту гісторыю СМІ асвятлялі не раз. Праляцелі гады, а сітуацыя не павярнулася ў лепшы бок — яна стала горшай. Таго пакоя, пра які журналісты пісалі «мара любой дзяўчынкі», «казка для любога дзіцяці», перапоўненага цацкамі, яркімі кніжкамі, больш не існуе. Мунір пераехаў у меншую кватэру, але кожную ляльку, кожную кофтачку, кожны дзіцячы малюнак сваёй дачкі захоўвае дагэтуль. Для бацькі маўклівыя рэчы-сведкі шчаслівага жыцця з дачушкай — да слёз важная памяць.

У сваю чаргу Алена перажывае, калі бачыць, што перад выхадам да бацькі дачка сумуе, нават плача. «Якімі цудоўнымі былі б гэтыя сустрэчы, як бы лёгка стала жыць Алесі, калі б Мунір не быў глухі да яе жаданняў! За 5 гадзін, адведзеных судом у суботу, дзяўчынка хоча і паесці, і проста павесяліцца з аднагодкамі. Не можа яна столькі часу не адрывацца ад бацькі. Алесі 8 гадоў. Яна мае ўласнае меркаванне, свой свет. А Мунір кіруецца сляпой любоўю, эгаізмам. Калі дачка гаворыць пра сваё жаданне наведаць кіно, ён адказвае: «Гэта мама табе так загадала? Ну?! Алена, што на гэты раз ты дазволіш нам зрабіць?!» Тады Алеся зрываецца на крык: «Не, мама ні пры чым!» І Мунір пры ёй тэлефануе псіхолагу, судоваму выканаўцу. Маўляў, Алеся — ахвяра псіхалагічнага гвалту. Дзяўчынка плача, ёй балюча зноў і зноў праходзіць праз гутаркі са спецыялістамі, соромна перад аднакласнікамі. Калі на ёй не акцэнтуюць увагу, то ўсе адзначаюць шчаслівы стан Алесі. Яна проста радуецца жыццю і не хоча цяжкасцяў, якія прыносіць сваімі паводзінамі Мунір. Я мару адпусціць гэты негатыў», — дзеліцца сваім болем маці.

**Кожнае пятае хворае на неўроз дзіця перажыло разлуку з бацькам. Асабліва востра яе перажываюць дзяўчаткі ва ўзросце ад двух да пяці гадоў.**

### Алесю спытаюць праз два гады

У 2012 годзе адбыўся першы суд, які дазволіў бацьку бачыцца з дачкой тры разы на тыдзень у прысутнасці маці. Чарговы суд вырашыў дадаць да гэтых сустрэч сумеснае правядзенне сямейных і дзяржаўных свят. Разбіранні працягваюцца.

Псіхолагі падкрэсліваюць: дзень нараджэння Алесі павінен адзначацца без таты, бо існуе востры канфлікт паміж бацькамі. Мунір мае права бачыцца з дачкой дзве гадзіны ў святочныя дні, але яму не падабаецца настрой дзяўчынкі, якая энтузіязму не праяўляе. Ён лічыць вінаватай у сапсаваных адносінах Алену, якая яшчэ два гады вымушана жыць з цяжарам на душы: суд слухае меркаванне толькі дзесяцігадовых дзяцей. Спецыялісты з аддзела адукацыі падкрэсліваюць: камфорт для дзіцяці — гэта пастаянная прысутнасць маці.

**У Беларусі 49% моладзі ва ўзросце ад 18 да 26 гадоў галоўнай драмай дзяцінства лічаць развод бацькоў.**

«Прабачце за параўнанне, але зняволеных у турме можна наведваць без чыёйсьці прысутнасці. Нават там ніхто не ўказвае, што вам можна сказаць, што нельга, і, вядома, ніхто не цісне на чалавека, якога вы прыйшлі наведаць, — гаворыць Мунір. — У маёй сітуацыі бачыцца з дачкой у прысутнасці маці — тое ж самае, што бачыцца ў прысутнасці чалавека, які супраць адносін з бацькам. Алеся стала марыянеткай».

Псіхалагічная экспертыза паказала, што Мунір можа выхоўваць дачку (у тым ліку без прысутнасці маці).

### Бацька таксама чалавек

Як паведамілі супрацоўнікі Белстата, статыстыка выпадкаў прысуджэння дзіцяці пасля разводу тату з'яўляецца вузкай, а таму не праводзіцца. На самай справе ў такой статыстыцы патрэбы няма. Толькі ў выключных выпадках (маці алкагалічка ці сама адмаўляецца ад малога) дзіця пакідаюць бацьку.

**Многія дзеці не маюць нікога, хто б біўся за іх увагу і хацеў навучыць усяму, што ведае і ўмее сам. Дзяўчынка мае ажно дваіх.**

Алегу Бакуліну, кіраўніку рэспубліканскага аб'яднання «Абарона правоў бацькоў і дзяцей», за дзень тэлефануе дзесяткі мужчын. Актыўнасць беларускіх бацькоў у імкненні выхоўваць сваіх малых вельмі высокая, яна расце штогод. «Мужчына любіць дзяцей не менш за жанчыну і гатовы змагацца за іх увагу да апошняга. Тут няма розніцы, іншаземец ён ці беларус», — кажа юрыст.

**Паводле даных брытанскага грамадскага аб'яднання, 50% мужчын пасля разводу губляюць сувязь з дзецьмі.**

Амаль 20-гадовы вопыт аб'яднання паказвае, што гісторыя Муніра — гэта анамалія. «Да трох гадоў Алесяй займаўся Мунір. Ён вёў інтэрнэт-старонку, дзе публікаваў фота кшталту «першая лыжка кашы», «нашы першыя крокі», «першыя словы», «любімыя гульні», — гаворыць Алег Бакулін.

«З-за чаго бацьку могуць абмежаваць у сустрэчах з дзіцем?» — пытаюся.

«Прычыны тры, — адказвае Алег Бакулін. — Псіхалагічная ненармальнасць, крымінальная судзімасць бацькі і малы ўзрост дзіцяці».

«Мужчыны рэдка дабіваюцца права бачыцца з дзіцем сам-насам, праводзіць разам святы, адпачынак?» — цікаўлюся.

«Дабіваюцца заўсёды!» — чую ў адказ.

### Як пісаў Леў Талстой

«Калі цягаць дзяўчынку да псіхолагаў і ўмешвацца ў яе дзяцінства ў кампаніі судовых выканаўцаў, то наўрад ці даб'ешся яе прыхільнасці і любові, ці не так? — лічыць сямейны псіхолаг Вольга Фралова. — Любіць — гэта не заўсёды настойліва быць побач, часам любіць — гэта сціснуўшы зубы адпусціць дзеля спакою таго, каго любіш. Калі ласка, прыйдзі, але тады, калі табе адчыняць дзверы. Хочаш добрых адносін з дзіцем — паважай і шукай агульную мову з яго маці. Можна судзіцца і 20 гадоў, але спакою не будзе, суд не мае сілы ў пытаннях прыязні, добрых адносін, сяброўства, любові».

Як бы ні вырашыўся гэты канфлікт, калі-небудзь Алеся вырасце, і, стаўшы дарослай, скажа сваё слова. Многія дзеці не маюць нікога, хто б біўся за іх увагу і хацеў навучыць усяму, што ведае і ўмее сам. Дзяўчынка мае ажно дваіх, больш за тое: яна мае дзве вялікія сям'і, адну у роднай Беларусі, другую — у іншым паўшар'і, далёка за акіянам.

Пытаю: «Мунір, чаму б вам не кінуць усё, не вярнуцца на радзіму і не стварыць там новую сям'ю, не нарадзіць другое дзіця?»

Ён адказвае: «Дзяцінства — гэта дзяцінства. Непаўторны час, самы важны, як пісаў Леў Талстой. Незабыўная пара ў жыцці дзіцяці і яго бацькоў. Я павінен быць побач з маёй дачкой».

Гісторыя застаецца адкрытай. А пакуль Мунір Амар рады яшчэ адной пляцоўцы, дзе ён можа сказаць: «Я люблю цябе, Алеся!»

**Маргарыта САДОЎСКАЯ.**

** Імёны герояў публікацыі змененыя па этычных прычынах*

■

■ Нататкі таткі

# Чаму трэба абавязкова вучыць сына біцца



**«Тата, а мяне Максім абзываў і біўся», — пажаліўся сын, калі я забіраў яго з садка. «Вазьмі наступным разам і лясні яму як мае быць!» — першая парада, што прыйшла мне ў галаву. Мае словы выпадкова пачула выхавальніца і развохкалася: «Тата! Як вам не сорамна! Чаму вы дзіця вучыце?!» Высветлілася, што заахвочваю сына да агрэсіі і што кепская хлопчыка трэба не біць у адказ, а сказаць пра яго выхавальніку. З аднаго боку, педагог нібы і мае рацыю: градус агрэсіі ў грамадстве трэба зніжаць. З іншага — уся мая бацькоўская існасць бунтуе: я размазню гадую ці мужчыну?**

Сам я ў садок амаль не хадзіў і ўпершыню з калектывам сутыкнуўся ў школе. І не магу сказаць, што мне гэта дужа спадабалася. Я гадаваўся ў досыць інтэлігентнай сям'і, дзе высвятляць адносіны кулакамі ды мацюкамі было не прынята і дзяцей вучылі быць культурнымі і ветлівымі. А каб кагосьці збіць або зняважыць — крый божа! Але калі на мяне пасыпаліся першыя пстрычкі, кухталі і выспяткі, я зразумеў, што гэткая светапоглядная сістэма пры ўсёй сваёй высокай этычнасці мае адну загану: вельмі балюча і крыўдна. Для мяне стала адкрыццём, што чалавека можна ўдарыць, знявавжыць проста так, без дай прычыны, толькі таму, што ён выглядае слабейшым і не праяўляе агрэсіі. Высветлілася, што ў іншых сем'ях культывуюцца зусім іншыя каштоўнасці: хто паспеў — той і з'еў. Закон джунгляў. І нягледзячы на сваё прозвішча, я доўга не мог прыстасавацца да гэтых парадкаў.

Псіхалагічныя траўмы маленства — самыя трывалыя. І калі ў цябе, дарослага дзевяностакілаграмовага дзядзькі, з'яўляецца ўласны сын, то ты міжволі хочаш засцерагчы яго ад паўтарэння сваіх колішніх памылак. І вучыш яго «жыццю»: калі нехта ўдарыць — дай здачы! «А мне выхавальніца сказала, што біцца нельга, што трэба ёй пажаліцца, каб яна на яго насварылася...» — чую ад сына, і хочацца лезці на сценку: што ж вы робіце, таварышы педагогі!

Можа, я сапраўды занадта згушчаю фарбы і разважаю, нібы галоўны герой серыяла «Фізрук», які ўсе праблемы намагаецца вырашыць наскокам і грубай сілай. Можа, сапраўды трэба вучыць дзіця дамаўляцца і шукаць кампраміс. Усё-ткі дваццаць першае стагоддзе на двары, а ты, дараженькі, хадзіў у школу акурат у 90-я, калі агрэсія ў грамадстве біла фантанам з усіх дзірак. Цяпер грамадства змянілася ды і дзеці сталі іншыя: сядзяць у інтэрнэтах і асвойваюць гаджэты. Можа, і сапраўды маюць рацыю педагогі: не трэба выхоўваць у дзіцяці культ сілы?

Але, папрацаваўшы ў журналістыцы, грамадства бачыш з розных бакоў. І сустракаеш як годных людзей, так і тых, хто не выклікае ў цябе станоўчых эмоцый. Дзеці ёсць як у першых, так і ў другіх, але гадуюцца яны ў зусім розных каштоўнасных сістэмах. І няма ніякае гарантыі, што твой сын не сутыкнецца з гэткімі ж самымі праявамі, да якіх у свой час не мог прывыкнуць ты. Больш за тое, я ўпэўнены, што ў кожным класе знойдзецца сама меней адзін «кепскі» хлопчык, ад якога будуць стагнаць педагогі і цярпець іншыя вучні.

І не кажыце, што мой сын будзе пад пільным наглядам настаўнікаў. Хоць бы таму, што за кожным прасачыць настаўнік не можа чыста фізічна. А яшчэ ў школе ёсць закуткі, раздзявальні пры спартзалах ды іншыя месцы, дзе можна ладзіць «дзедаўшчыну», не прыцягваючы ўвагі дарослых. Але кпіны і здзекі адразу спыняюцца, калі крыўдзіцелі сутыкаюцца з рашучым адлупам: ахвяра перастае быць зручнай.

У той самы час я, калі што якое, не буду казаць дзіцяці: «Ты што, не мужык? Сам разбярацца не можаш?» А буду хадзіць у школу і дабівацца таго, каб ніхто не смеў зневажаць майго сына. Бо пакінуць яго сам-насам з праблемай — гэта найгоршае, што можа зрабіць бацька.

І нават калі сын трапіць у добры клас у прыстойнай школе, усё адно трэба змалку тлумачыць яму, што ёсць добрыя людзі, а ёсць кепскія. І што з апошнім часам даводзіцца размаўляць на зразумелай ім мове. Нават калі такі выпадак бывае ўсяго раз на жыццё. Але ж ніхто не ведае, калі ён можа надарыцца.

На мой погляд, гэта і ёсць ідэал сапраўднага шляхетнага мужчыны — чалавека, які паважае сябе, здольны абараніць сябе і блізкіх, але пры гэтым ніколі не стане крыўдзіць і зневажаць слабейшых. Магчыма, ідэал крыху архаічны, але ў наш час гэтай здаровай архаікі часта не стае.

**Валянцін БОЙКА**

■